# 150 ГОД З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ БЕЛАРУСКАГА І ПОЛЬСКАГА ЭТНОГРАФА, ФАЛЬКЛАРЫСТА Ч. Г. ПЯТКЕВІЧА

***Кацярына Варанько, вядучы бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі***

Унікальнай фігурай у беларускім народазнаўстве стаў беларускі і польскі этнограф і фальклярыст Чэслаў Пяткевіч (1856–1936), які з энцыклапедычнай шырынёй расказаў свету пра Рэчыцкае Палессе на пэўным гістарычным этапе. Яго лёс як вучонага незвычайны. У навуку ён прыйшоў амаль у семдзесят год, дзякуючы вядомаму польскаму славісту К. Машынскаму, які лічыў Пяткевіча сваім хросным бацькам у навуцы. Ён нарадзіўся ў сям'і шляхціца. Рана страціў бацьку і мусіў зарабляць на жыццё ўласнымі рукамі. Працаваў у смалакурнях і броварах, аканомам у панскіх маёнтках. Ч. Пяткевіч да драбніц ведаў сялянскае жыццё. Яго маці дала сваім дзецям добрую хатнюю адукацыю. Калі да гэтага далучыць выдатную памяць Ч. Пяткевіча, становіцца зразумела, адкуль багацце тых ведаў, якія потым былі выкладзены ў яго кнігах і артыкулах.

У 1911 г. Ч. Пяткевіч пазнаёміўся з 24-гадовым выпускніком Кракаўскай акадэміі мастацтваў К. Машынскім, які якраз збіраўся заняцца даследаваннем культуры славян. Веданне Пяткевічам Рэчыцкага Палесся вельмі дапамагло маладому даследчыку. І калі ў 1923 г. Ч. Пяткевіч пераехаў у Варшаву, К. Машынскі запрасіў яго на працу ў аддзел этналогіі Інстытута антрапалагічных і этналагічных навук Варшаўскага навуковага таварыства. З 1928 г. Ч. Пяткевіч пачаў працаваць у этнаграфічнай камісіі Акадэміі навук у Кракаве.

У 1925 г. у польскім часопісе «Ziemia» быў апублікаваны першы артыкул 69-гадовага Ч. Пяткевіча «Да пытання гісторыі шкларобства на Валынскім Палессі». Потым з'явіліся яго артыкулы «Дарогі на Рэчыцкім Палессі ў другой палове XIX стагоддзя», «Палессе ў канцы XIX стагоддзя (пажары сасновых лясоў і балот)», нарыс «Хойнікі» і інш. Грунтоўная манаграфія Ч. Пяткевіча пра матэрыяльную культуру Усходняга Палесся «Рэчыцкае Палессе» выйшла асобным выданнем у 1928 г. у Кракаве. У ёй раскрываецца ўсё багацце матэрыяльнай культуры названага рэгіёна. Аўтар асвятляе літаральна ўсе заняткі і рамёствы палешукоў, прычым кожны прадмет сялянскага ўжытку суправаджаецца не толькі слоўным апісаннем, але і адпаведным аўтарскім малюнкам. Кніга стала важным этапам у развіцці даследавання Палесся і засведчыла, што ў навуку прыйшоў цікавы і таленавіты даследчык. Адразу пасля яе выхаду Ч. Пяткевіч узяўся за падрыхтоўку другой сваёй працы, прысвечанай духоўнаму свету палескага селяніна. У 1938 г. (ужо пасля смерці аўтара) манаграфія «Духоўная культура Рэчыцкага Палесся» пабачыла свет. У кнізе змешчаны апавяданні, казкі, легенды, пераказаныя менавіта так, як яны гучалі ў вуснах народа; вялікая колькасць запісаў прыпадае на прыказкі і прымаўкі. Меркаваў даследчык напісаць і кнігу, прысвечаную грамадскай культуры Рэчыцкага Палесся, але да нашчадкаў дайшоў толькі фрагмент гэтага рукапісу, астатняе загінула ў час Другой сусветнай вайны.

Ч. Пяткевіч прымаў удзел і ў падрыхтоўцы да друку пасмяротнага выдання IV тома М. Федароўскага «Люд беларускі», у які ўнёсіў свае дапаўненні і каментарыі, дапамагаў у выданні кнігі К. Машынскага «Усходняе Палессе: этнаграфічныя матэрыялы». У сваіх працах Ч. Пяткевіч не рабіў падагульняючых вывадаў, не даследаваў тэарэтычныя пытанні. Вялікую каштоўнасць для нашчадкаў уяўляе «тая бяспрыкладная па вычарпальнасці інфармацыя ў галіне народнага

побыту і культуры Палесся, якая была сабрана ў яго манаграфіях і артыкулах»*.

Зробленае Ч. Пяткевічам назаўсёды захавала для навукі бясцэнныя старонкі жыцця гэтага надзвычай цікавага кутка беларускай зямлі, дазволіла заняць даследчыку трывалае месца ў яе гісторыі.


*Пяткевіч,* Ч. Вялікдзень на Беларусі / Ч. Пяткевіч; пер. з польск. Л. Салавей // Роднае слова. — 2001. — № 4. — С. 100–103.

*Пяткевіч, Ч.* Грамадская культура Рэчыцкага Палесся : фрагменты / Ч. Пяткевіч; [пер. з польск.]; прадм. і публ. У. Васілевіча // Полымя. — 1999. — № 10. — С. 153–179.

*Пяткевіч,* Ч. Рэчыцкае Палессе : [пер. з польск.] / Ч. Пяткевіч; [уклад., прадм. У. Васілевіча]. — Мінск : Беларус. кнігазбор, 2004. — 670 с., [2] л. іл. : іл. — (Беларус. кнігазбор. — Сер. II. Гісторыка-літаратурныя помнікі).


**Аб жыцці і дзейнасці вучонага**


*Бязручка, І. П.* Чэслаў Пяткевіч — этнограф «чыстага» Палесся / І. П. Бязручка // Духоўная і культурная спадчына Беларускага Палесся : матэрыялы навук. канф. (18–19 верас. 1997 г.) / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. — Гомель, 1998. — С. 123–125.

*Васілевіч, У. А.* Чэслаў Пяткевіч / У. А. Васілевіч // Збіральнікі. — Мінск, 1991. — С. 134–167.

*Васілевіч, У. А.* Ч. Пяткевіч / У. А. Васілевіч // Беларуская фалькларыстыка: збіранне і даследаванне нар. творчасці ў 60-х гадах XIX — пач. XX ст. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. — Мінск, 1989. — С. 309–316.

*Мятліцкі, М.* Чэслаў Пяткевіч : [верш] / М. Мятліцкі // Бабчын : кн. жыцця. — Мінск, 1996. — С. 90–91.

*Пяткевіч (Pietkiewich) Чэслаў Генрыхавіч* // Асветнікі зямлі Беларускай, X — пач. XX ст. : энцыкл. давед. — Мінск, 2001. — С. 335–336.

*Пяткевіч (Pietkiewich) Часлаў* // БелЭн : у 18 т. — Мінск, 2001. — Т. 13. — С. 164.

*Пяткевіч (Pietkiewich) Часлаў* // Энцыкл. гісторыі Беларусі : у 6 т. — Мінск, 2001. — Т. 6. — Кн. I. — С. 18.

*Салавей, Л.* Вялікі знаўца Палесся, чалавек-энцыклапедыя : пра Ч. Пяткевіча / Л. Салавей // Роднае слова. — 2001. — № 4. — С. 99.


---

* *Васілевіч, У.* Сага пра Палессе / У. Васілевіч // Рэчыцкае Палессе / Часлаў Пяткевіч. — Мінск, 2004. — С. 13.